35-я ГАДАВІНА З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (1249) ● 29 чэрвеня 1979 г. Цана 2 кап.

Раман ТАРМОЛА

Мы жывымі былі...
Мы вось тут закапаны —
Каля гэтай шырокай
каменнай сцяны,
Дзе ўзыходзяць вясной
Дзесяць тысяч
цюльпанаў,
Адзін колер, чырвоны,
і лёсы адны.
Мы жывымі былі...
Мы вось тут закапаны...
Перыскопы-цюльпаны
у неба глядзяць.
Гэта мы пазіраем —
Сцяпаны... Іваны...
Як над намі аблокі
і гусі ляцяць.
Мы жывымі былі...
Мы вось тут закапаны...
На грудзях гімнасцёркі
пад колер травы.
Дзесяць тысяч
цюльпанаў...
Адзін з іх зламаны,
Быццам вецер пілотку
сарваў з галавы.
Мы жывымі былі...
Мы вось тут закапаны
Без імёнаў і прозвішчаў,
год нашых, дат
Толькі час нашай смерці
у граніце названы
Ды адно неабдымнае
слова —
САЛДАТ!

Неўміручасць подзвігу

У Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў савецкі народ адстаяў сацыялістычныя заваёвы, разграміў фашысцкую Германію, пазбавіў чалавецтва ад пагрозы нацысцкага заняволення.

У адзіным страі з усім многанацыянальным савецкім народам абаранялі сваю Радзіму і працоўныя Беларусі.

Буржуазныя фальсіфікатары гісторыі імкнуцца прынізіць высокі патрыятызм працоўных Беларусі. Яны сцвярджаюць, што беларускі народ у барацьбе з фашызмам абыякава адносіўся да сваіх сацыялістычных заваёў, што ў Савецкай Беларусі былі моцнымі антыкамуністычныя настроі сярод калгаснікаў і інтэлігенцыі. Антысаветчыкі розных масцей заяўляюць, быццам насельніцтва Беларусі ў пачатку вайны варожа адносілася да савецкага ладу і чакала фашысцкіх акупантаў. Але, сцвярджаюць фальсіфікатары, акупацыйныя ўлады «не знайшлі правільнага падыходу» да насельніцтва, дапусцілі «промахі» ў адносінах да яго і тым самым упусцілі магчымасць прыцягнення мясцовага насельніцтва на свой бок.

Вымыслы буржуазных фальсіфікатараў абвяргаюцца рэальнымі фактамі мінулай вайны. Аб якой антысавецкай арыентацыі насельніцтва Беларусі можа ісці гаворка, калі ва ўзброенай барацьбе з фашысцкімі захопнікамі ў радах Савецкай Арміі ўдзельнічала звыш аднаго мільёна ста тысяч працоўных Беларусі і больш як 440 тысяч у партызанскіх атрадах і падполлі.

Для аказання дапамогі Савецкай Арміі толькі ва ўсходніх абласцях рэспублікі к 15 ліпеня 1941 года з добраахвотнікаў, якія не падлягалі прызыву ў армію, было створана 78 знішчальных батальёнаў, у якіх налічвалася звыш 13 тыс. чалавек. У гэты перыяд дзейнічала больш як 200 фарміраванняў народнага апалчэння, якія налічвалі звыш 33 тыс. чалавек.

Як бы ні імкнуліся лжэвучоныя, праўду гісторыі ніхто не зможа скрыць, ніколі не сатруцца ў памяці савецкіх людзей імёны герояў знішчальных батальёнаў і народнага апалчэння, якія ў першыя ж дні вайны разам з байцамі Савецкай Арміі перагарадзілі шлях ворагу.

Мужнасць у барацьбе з ворагам праявілі працоўныя горада Магілёва. Разам з савецкімі байцамі гераічна змагаліся апалчэнцы цагельнага завода, шаўковай фабрыкі, студэнты педінстытута і іншыя. З камсамольцаў, навучэнцаў старэйшага ўзросту былі створаны ўдарныя групы бранябойшчыкаў. Камсамольцы сваімі сіламі сабралі гаручай сумесі больш як 200 тыс. шклянак і даставілі іх на баявыя пазіцыі воінаў і апалчэнцаў.

Доблесна змагаліся на подступах да Магілёва апалчэнцы шаўковай фабрыкі на чале са старшынёй парткома фабрыкі камуністам А. В. Шчарбаковым. На паўночна-заходняй ускраіне Магілёва ў радах абаронцаў горада доблесна змагаўся батальён міліцыі, якім камандаваў капітан К. Т. Уладзіміраў.

Упартая і працяглая магілёўская абарона мела вялікае значэнне для ажыццяўлення аперацый Савецкай Арміі на заходнім напрамку. Абаронцы прыцягнулі да сябе 4 нямецкія пяхотныя дывізіі, частку сіл 10-й мотастралковай дывізіі СС (райх), 3-ю танкавую дывізію. У баях за Магілёў па няпоўных даных было збіта некалькі дзесяткаў самалётаў, знішчана і пашкоджана амаль 500 танкаў, 1500 аўтамашын, каля 700 матацыклаў, знішчана не менш як 30 тыс. і узята ў палон каля 2 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка.

«Гераічная 23-дзённая абарона Магілёва, — пісаў маршал Савецкага Саюза А. І. Яроменка, — з'яўлялася прыкладам доблесці і самаадданасці савецкіх воінаў і грамадзянскага насельніцтва, іх непарушнага адзінства».

Каля трох сутак сумесна з воінамі Савецкай Арміі адбівалі атакі праціўніка ля вёскі Рогава (20 кіламетраў паўночна-заходней Мінска) знішчальны атрад, які складаўся з мясцовых жыхароў і вучняў старэйшых класаў Рогаўскай школы. Камандаваў атрадам дырэктар школы М. С. Собалеў. Байцы-знішчальнікі напаўнялі шклянкі бензінам і дастаўлялі іх чырвонаармейцам, падносілі на агнявыя пазіцыі ваду і ежу, а таксама вялі агонь па праціўніку. Многія з іх паказалі прыклады мужнасці і адвагі.

Значную дапамогу Савецкай Арміі ў абарончых баях на тэрыторыі Беларусі аказалі таксама і байцы апалчэнскіх фарміраванняў Гомельскай вобласці.

Планы гітлераўцаў акружыць і знішчыць 21-ю і 3-ю Арміі пацярпелі поўны крах. Часці Савецкай Арміі, апалчэнцы толькі ў баях на подступах да Гомеля і ў горадзе па няпоўных даных знішчылі звыш 80 тыс. салдат і афіцэраў, больш як 200 танкаў, каля 100 самалётаў. Многія фашысцкія часці страцілі да 60—80 працэнтаў свайго асабовага саставу.



У аднаго захопленага ў палон фашысцкага фельдфебеля Штара было знойдзена пісьмо. Ён пісаў сваёй жонцы ў Мюнхен: «Вось мы і ў Гомелі. Я кажу мы таму, што я так прывык табе пісаць, падразумяваючы пад «мы» нашу роту. Дзесяць дзён назад нас было 138 чалавек у роце, зараз нас засталося 18».

Актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам прымалі выкладчыкі і студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ужо ў першыя дні вайны ў рады Савецкай Арміі ўступіла звыш 450 чалавек з ліку студэнцкай моладзі і супрацоўнікаў БДУ. Шмат студэнтаў і выкладчыкаў праявілі мужнасць у барацьбе з акупантамі ў саставе партызанскіх фарміраванняў і ў падполлі. Выпускніку фізіка-матэматычнага факультэта В. А. Парахневічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Вынікі вайны зноў пацвердзілі словы В. І. Леніна: ніколі не перамогуць таго народа, у якога рабочыя і сяляне ў большасці сваёй пазналі, адчулі і ўбачылі... што адстойваюць тую справу, перамога якой ім і іх дзецям забяспечыць магчымасць карыстання ўсімі багаццямі культуры, усімі здабыткамі чалавечай працы.

Н. ПАЛУЛЕХ,
студэнт V курса гістарычнага факультэта.

НЕ СПЫНЯЦЦА

Кожнае лета імчацца на ўсход цягнікі, якія ўпрыгожаны задорнымі плакатамі. Пасажыры — хлопцы і дзяўчаты ў будатрадаўскай форме. Адзін з такіх саставаў прывёз у Томскую вобласць у 1975 годзе атрад «Зубронак» факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. Сярод байцоў быў Ігар Лебедзеў — студэнт другога курса. Работа на працягу двух месяцаў на будаўніцтве ТЭЦ і сховішчаў для гародніны ў Стрыжавым была першым працоўным хрышчэннем Ігара.

На наступны год ужо на чале будатрада «Зубронак» Ігар пабываў у Казахстане. Тут рабяты з БДУ дапамагалі мясцоваму калгасу ўзводзіць жылыя будынкі. Да гэтага часу ўспамінаюцца Ігару неабсяжныя стэпы, саракаградусная гарачыня. Толькі некалькі зялёных таполяў, якія раслі ў цэнтры калгаснай сядзібы, увесь час прыцягвалі да сябе будатрадаўцаў, напаміналі зялёную Беларусь...

Затым было яшчэ і нялёгкае працоўнае лета на будоўлях роднай рэспублікі.

Аб гэтых часах Ігар успамінае з лёгкім сумам. Зараз ён выпускнік. Ззаду пяць універсітэцкіх гадоў з радасцямі і засмучэннямі, поспехамі і памылкамі, экзаменамі і залікамі.

— За гэтыя гады я здаў 54 прадметы, — усміхаецца Ігар,—у выніку атрымаў пэўныя прафесіянальныя навыкі і матэматычны спосаб мыслення. Гэта дазваляла мне ў апошнія гады вучобы лагічна вылічваць сваю экзаменацыйную адзнаку амаль па кожнаму прадмету...

Мы сядзім у пакоі інтэрната за чаем.

— З чаго пачалося для цябе універсітэцкае жыццё?

— З выпадковасці, — адказвае Ігар. — Сабраўся паступаць у інстытут дружбы народаў у Маскве. Сабраў усе неабходныя дакументы і адвёз іх туды, але з адной характарыстыкай не паспеў управіцца к тэрміну, і таму не давялося здаваць экзамены. Вярнуўся дадому. У БДУ на ФПМ займаўся мой сябар, ён і параіў паступіць на гэты факультэт. Так я аказаўся на падрыхтоўчым аддзяленні. Да паступлення сюды закончыў Салігорскі горна-механічны тэхнікум, потым два гады службы ў арміі. Пасля арміі год працаваў...

— Калі паступаў, здавалася, усё будзе лёгка: закончыў тэхнікум, армію прайшоў, шмат чаго ў жыцці пабачыў. Але было ўсё не так проста. Былі экзамены, якія не ўдавалася здаваць з першага разу, атрымліваў і тройкі, паяўляліся часам думкі кінуць усё гэта. Але паступова асвоіўся, пазнаў шмат новага, дапамаглі сябры — і ўсё пайшло, як трэба. Канешне, жыццё студэнцкае, ды і вучоба былі не такімі, як уяўлялася.

Аб'ём таго, што нам чыталі, вельмі вялікі. І я лічу, не ўсё нам спатрэбіцца ў будучай рабоце.

— Ігар, ты задаволен атрыманай адукацыяй, не шкадуеш аб праведзеных ва універсітэце гадах?

— Не, я тут шмат пазнаў, атрымаў добрую прафесію праграміста.

ЭВМ можа рабіць усё: лічыць, кіраваць, перакладаць тэксты, нават маляваць, пісаць вершы, гуляць у шахматы. Але, як гавораць у нас, без праграміста машына — куча металу. Мы ў яе ўдыхаем жыццё, даём ежу для яе мозгу.

За час вучобы асвоіў машыны ЕС-22, ЕС-1020, Мінск-32. Зараз вось абараніў дыплом. Пераддыпломную практыку праходзіў у СКБ пры Акадэміі навук. Па размеркаванню буду працаваць у Віцебску, у інфармацыйна-вылічальным цэнтры.

— Акрамя вучобы, што яшчэ са студэнцкага жыцця запомнілася?

— Што яшчэ? — паўтарыў Ігар. — Спортам займаўся, у вольны час люблю чытаць. Вось, напрыклад, Валерый Восіпаў вельмі падабаецца. Прапаную пачытаць. Закончыў нядаўна. «Стракаты камень» Уладзіміра Чывіліхіна — моцная рэч. Генадзій Бачароў, Віль Ліпатаў — гэта любімыя пісьменнікі.

Тры гады гуляў у футбол за зборную універсітэта. Хадзіў таксама ў паходы разам з турыстамі. Запомніўся зімні паход 2-й катэгорыі складанасці па маршруту Полацк — возера Мезазол — Хатынь. Мароз, завіруха. Ідзеш, лыжы тонуць у снезе, вецер збівае з ног. Бывалі дні, калі мы праходзілі толькі па 11 кіламетраў. Але ўсё-такі мы дайшлі, нягледзячы ні на што.

— Ігар, што ты адчуваеш цяпер, калі універсітэт ужо закончан і дыплом, як гаворыцца, у кармане?

Ігар устаў, закурыў.

— Неяк неспадзявана ўсё скончылася. Пакуль ніякіх турбот, але я не магу без справы. Збіраюся ехаць з будатрадам на Байкал. У апошні раз...

Ал. ДЫНІКАЎ.

За пяць мінут да абароны.

Фота **У. Шубы.**

Прайшло пяць год з дня пасвячэння ў студэнты. Самы апошні, бадай, самы цяжкі экзамен у студэнцкім жыцці — абарона дыпломнай работы.

Дыплом... Зусім невялікае, але якое важкае слова. У яго ўкладзена праца пяці год.

Дыплом... Колькі за ім сесій, экзаменаў і залікаў, лекцый і практычных заняткаў, прачытаных і непрачытаных кніг, спісаных агульных сшыткаў, назва якім — канспект! Колькі бяссонных начэй, часам ад хвалявання, нярэдка ад недахопу часу, стаіць за ім.

Дыплом... Не будзе больш шалёна біцца сэрца ад хвалявання, калі вы-

Еще мои — твои профессора.
Еще о длинных сессиях «вчера...»
Я говорю. Еще прошли не годы...
И все-таки я чувствую уже
Разлуки близкой горечь на душе,
И новые зовут меня заботы.

О, были дни! Какие были дни!
Еще вблизи, еще теплы они,
Еще я озарен их ясным светом.
Но мне вопрос не удержать,
как вздох:
«Неужто я шагнул через порог
И распрощался с университетом?»

Анатолий ИВАНОВ.

МЭТАНАКІРАВАНАСЦЬ

Пяць студэнцкіх год. Многа гэта ці мала ў жыцці? Бадай, кожны адкажа па-свойму, але ў залежнасці ад дасягнутага, ажыццёўленага.

Завітаем на гістфак. Лісток паперы на дошцы аб'яў абвяшчае: урачыстае ўручэнне дыпломаў адбудзецца ў 14.00 26 чэрвеня 1979 года...

Выпускніка знайсці цяжка. У кожнага свой клопат. Адзін усё ніяк не ачуняе ад ліхаманкі дзяржэкзаменаў, другому патрэбен абхадны лісток. У трэцяга...

У трэцяга грамадская работа: падрыхтоўка будатрада для Слабадзейскай зоны, што ў Малдавіі. Байцоў у атрадзе — шэсць тысяч. Нацыянальнасць — самая розная. Ад літоўцаў да эвенкаў. Камісар штаба — выпускнік Адам Кішкевіч.

Крыху фактаў. Скончыў аддзяленне гісторыі, выдатнік (за пяць год атрымаў усяго тры чацвёркі). Апошнія тры гады нязменны партгрупорг курса, адначасова і член акадэмічнай камісіі. Быў членам камітэта камсамола падрыхтоўчага аддзялення, старшынёй штаба КП, членам камітэта ДТСААФ факультэта.

Пяцікурснік і размеркаванне... Гэтыя словы заўсёды побач. Многае залежыць ад таго, дзе ты пачнеш свой шлях да вяршыні прафесіі.

— Мая мара, — дзеліцца думкамі Адам, — стаць гісторыкам-педагогам, вучоным. Гісторыя, я не баюся высокіх слоў, аб'ядноўвае асновы ўсіх чалавечых ведаў, акумулюе іх.

У Кішкевіча спакойны твар. упэўнены голас. Усё сказана, як штосьці даўно-даўно прадуманае, вынашанае ў сабе.

А зараз, пасля заканчэння, Адам будзе працаваць у партбюро факультэта. Мара і рэальнасць... На першы погляд— два полюсы.

Але Кішкевічу так не здаецца. На працягу 1979-80 навучальнага года ён будзе здаваць кандыдацкі мінімум. Сапраўдны вучоны, лічыць Адам, павінен выступаць у трох іпастасях: педагог, грамадскі дзеяч, арганізатар. Работа ў партбюро, наогул грамадская работа — гэта добрая падмога.

Калі Кішкевіч быў у арміі, рабочым лесазавода, то высветлілася адно — цяга стаць гісторыкам. У БДУ мэта ўдакладнілася — стаць вучоным, педагогам.

Першыя крокі да пастаўленай мэты А. Кішкевіч рабіў у студэнцкім таварыстве НДР.

Навукова-даследчыя работы па грамадскіх навуках маюць сваю спецыфіку. Не будзем пералічваць усё. Адзначым хоць бы тое, што напісаць сапраўдную навуковую работу без сувязі з курсавымі і дыпломнай практычна немагчыма. (Час не дазваляе студэнтам такой раскошы — дасканала вывучыць дзве працілеглыя праблемы, распрацаваць іх).

Таму тэма навуковай і курсавой у першакурсніка Кішкевіча фармулявалася аднолькава: «Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі». Год ад году кола закранутых праблем расшыралася, паглыблялася, абгрунтоўвалася фактамі, прыкладамі.

Тэма дыпломнай была такой: «Дзейнасць партарганізацыі камвольнага камбіната па ідэйна-выхаваўчай рабоце сярод рабочай моладзі». Работа была абаронена на выдатна і рэкамендавана да публікацыі.

А. Кішкевіч закрануў вельмі актуальныя пытанні. Каб не быць галаслоўнымі, адзначым такі факт. У адным з асноўных вывадаў гаворыцца: «Асаблівую ўвагу партарганізацыя камбіната павінна ўдзяляць палітыка-выхаваўчай рабоце сярод моладзі па месцу жыхарства».

Дыпломная работа была абаронена ў той дзень, калі ў газетах надрукавалі пастанову ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». У пастанове значыцца: «Удасканальваць выхаваўчую работу па месцу жыхарства».

— Тэма, як бачыце, — гаворыць Адам, — вельмі надзённая, цікавая. Хачу працаваць над ёю і далей.

Верыцца, што мара выпускніка А. Кішкевіча стане яго жыццёвым прызваннем.

Л. ДЗЕНІСЕВІЧ.

кладчык бярэ ў рукі тваю залікоўку, бязмернай радасці, калі ён выводзіць у ёй «выдатна».

Ты робіш апошні крок і ў апошні раз стаіш ля дошкі.

Дыплом... Засталося нямнога, і ты — малады спецыяліст. Не вельмі важна, кім ты будзеш — географам ці матэматыкам, інжынерам ці выкладчыкам. Галоўнае, каб твая работа прыносіла людзям карысць і радасць.

Дыплом... Ты трымаеш яго ў руках, і здаецца, ужо ўсё ззаду.

А можа толькі пачынаецца?..

Ты, калі ласка, не забудзь, што ты— студэнт Белдзяржуніверсітэта.

ЖЫЦЦЁВАЕ КРЭДА

МУДРАЯ прымаўка гаворыць: «Калі хочаш паглядзець на чалавека збоку, зрабі так, каб ён гэтага не заўважыў».

Я так і паступіла. Спачатку пацікавілася насценным друкам факультэта. Са стэнда выдатнікаў глядзела на мяне прыгожая дзяўчына з сур'ёзнымі вачыма. У насценным друку кафедры фізіялогіі раслін Лена значылася як актыўны член студэнцкага навуковага гуртка, яго староста.

Іду па доўгаму калідору бія-

фака. Ля насценгазеты тры дзяўчыны ажыўлена абмяркоўвалі заметку. Ў размове было, між іншым, названа прозвішча Прасвірніцай. Я, зразумела, пацікавілася, як яны адносяцца да Лены. І пачула, што дзяўчына — ленінскі стыпендыят, заражае студэнтаў сваім аптымізмам, задорам, жаданнем дабівацца ў вучобе большага.

... Закончыліся заняткі. Апусцелі аўдыторыі. Разбегліся апошнія стайкі студэнтаў. Адчыняю дзверы камітэта камсамола. Незвычайна многалюдна і шумна. Падыходжу да стала намесніка сакратара Мікалая Няхайчыка.

«Сціплая дзяўчына, — горача адклікнуўся ён на просьбу расказаць аб Лене і, крыху памаўчаўшы, дабавіў упэўнена: —І добры чалавек. Пры ўсёй сваёй занятасці нікому не адмовіць у дапамозе. Лена заўсёды ў ліку арганізатараў. Яна не прапусціла ні адной студэнцкай канферэнцыі універсітэта... Гэта студэнтка не мысліць сябе без грамадскай работы».

Цяпер мне не хапала сустрэчы з самой Ленай. Праўда, я не дамовілася з ёю напярэдадні і тым самым зрабіла памылку: застаць актывістку дома было вельмі складана.

Гасцінна сустрэла мяне на парозе яе маці, маленькая, кволая жанчына са смуглым тварам і вельмі выразнымі вачыма. Такія ж вочы глядзелі на мяне са стэнда выдатнікаў і актывістаў. Гартаю «Літаратурную газету», размаўляю з бацькамі.

І вось доўгачаканая сустрэча з Ленай. Яна — худзенькая, сціплая, зусім не падобная на пяцікурсніцу. Адкрыты твар. Сур'ёзны, глыбокі погляд. Акуратна ўкладзеныя каштанавыя валасы.

«Як цудоўна! — Лена расчыняе акно, удыхае водар гарачага летняга поўдня. — Гэта ж кавалачак маёй зямлі». Яна з усмешкай назірае, як сварацца вераб'і, а дзесці імкнуцца іх прымірыць крошкамі хлеба. Потым садзіцца за піяніна.

Зачараваная, слухаю «Лунную санату»... Лена прачытае вершы любімага паэта Хейтагурава, запросіць у оперны тэатр, пачастуе салодкім пірагом, які сама спякла. Але на просьбу расказаць аб сабе я пачула скупыя словы: «Закончыла школу з залатым медалём, паступіла ва універсітэт, рыхтуюся да абароны дыплома».

Не падумайце, што я хацела знайсці прамы адказ на пытанне, як стаць ленінскім стыпендыятам ці маладым даследчыкам. Хутчэй, мяне цікавіла, чаму для многіх студэнтаў спалучэнне выдатнай і добрай вучобы з грамадскай работай стала арганічнай патрэбнасцю.

— Калі, па-твойму, чалавек задумваецца аб прызванні?

— Відаць, калі неабходна крута змяніць сваё жыццё. Што датычыць мяне, то ўжо ў дзевятым класе марыла прысвяціць сябе біяхіміі раслін.

Біялогія заўсёды была для яе «яе вялікасцю». Яна мела маральнае права стаць студэнткай біялагічнага факультэта, таму што з дня на дзень, з году ў год цярпліва і настойліва ішла да запаветнай мэты.

Прачытала ў газеце аб'яву аб наборы слухачоў у школу юных біёлагаў і запісалася адной з першых. Загадчыца кафедры фізіялогіі раслін Л. В. Кахновіч прапанавала пятнаццацігадовай дзяўчынцы эксперыментальную работу «Храматаграфія амінакіслот на паперы». Даследаванні першай самастойнай работы Лены былі адобраны выкладчыкамі.

Потым яна зацікавілася тэмай «Пытанні аб механізме фотасінтэтычнага акіслення вады». А ў 1979 годзе на рэспубліканскую студэнцкую навуковую канферэнцыю прадстаўляецца работа «Прымяненне імунахімічных метадаў у вывучэнні структурнай арганізацыі фотасінтэзуючых мемаран». Работа была ўдастоена першай катэгорыі і апублікавана ў навуковым зборніку.

Паміж гэтымі дзвюма вехамі ў даследчай дзейнасці цяперашняй выпускніцы біяфака ляжыць шлях адкрыццяў у навуцы сваіх творчых магчымасцей.

Цяжка сказаць, ці была ў яе глыбокая зацікаўленасць якой-небудзь канкрэтнай тэмай, калі яна прыйшла на першым курсе ў гурток кафедры фізіялогіі раслін. Захапіла творчая атмасфера ў гуртку, кіраўніком якога з'яўляецца загадчыца кафедры Л. В. Каханавіч. Яна прапанавала Лене тэму, якая стала тэарэтычным абагульненнем апошніх дасягненняў біялогіі па механізму фотасінтэзу.

Студэнтка прыйшла да вельмі простай ісціны: знаходзіць перш за ўсё патрэбную літаратуру, умець яе аналізаваць, навучыцца прыгожа працаваць рукамі. У выніку праведзеных даследаванняў Лене давялося ўстанавіць спецыфічнасць узаемадзеяння імуннай сывараткі трусоў з індывідуальнымі пігментамі фотасінтэтычнага апарата. Тэму, якой прысвяціла сябе Лена, чакае вялікае будучае. Бо фотасінтэз — вытак жыцця на зямлі. Калі навука глыбока вывучыць механізм фотасінтэзу, чалавецтва зможа вырашыць многія праблемы харчавання. Вялікую практычную значнасць мае і яе дыпломная работа «Рэакцыі гаптэннага тармажэння».

Прасвірніна — член камітэта камсамола, старшыня савета выдатнікаў. Аб яе грамадскай рабоце гаварыць і пісаць можна многа. Лепшым пацвярджэннем і ацэнкай гэтага служаць граматы, конкурсныя дыпломы, Ганаровая грамата ЦК ВЛКСМ.

Цяжка даводзіцца Лене. Часта стомленасць валіць з ног, і, здаецца, няма сіл, каб падняцца. Але яшчэ цяжэй нічога не рабіць. Чалавек жыве, калі ў яго ёсць любімая праца. Толькі ў працы адчуваеш біцца жыцця.

— Я так шмат узяла ў людзей, што ўсё жыццё буду перад імі ў неаплатным даўгу. Вось чаму словы першадрукара Івана Фёдарава: «Дапамажы аддаць сябе людзям. Не дай утаіць хоць часцінку душы» — сталі маім жыццёвым крэдам.

А. МАЗАЛЁВА.



Студэнтка ФПМ Наташа Ламаносава закончыла універсітэт на выдатна.

Фота **У. Шубы.**

СЛОВА ТАБЕ, ВЫПУСКНІК

Сёння яны самі яшчэ не зусім уяўляюць сябе маладымі спецыялістамі, пакінуўшымі сцены універсітэта. І можа таму кожнаму з іх крыху цяжка вось так адразу адказаць на пытанне: чым былі адметныя гады вучобы? Спыняюцца, задумваюцца, а потым...

Ларыса Казлоўская, мехмат, будучая супрацоўніца НДІ сродкаў аўтаматызацыі:

— Што запомнілася больш за ўсё? Адразу так і не адкажаш: усё было цікава. Матэматыка —навука не з лёгкіх, таму даводзілася шмат працаваць. Але заўсёды побач былі, як гаворыцца, «дзве сотні сяброў», гатовыя дапамагчы ў любую хвіліну.

Зоя Гладкая, юрфак, накіравана юрысконсультам у сельгасупраўленне Магілёўскай вобласці:

— Кожны год вучобы быў цікавым па-свойму. Вельмі хацелася б паўтарыць ўсё спачатку. Здаецца, тады б і адносіны да вучобы былі больш уважлівымі. Толькі цяпер, на парозе самастойнай працы адчуваеш, што паспеў за гэтыя пяць гадоў значна менш, чым мог бы...

Ларыса Рахманава, фізфак, па размеркаванню будзе працаваць у Смаргоні:

— Універсітэт навучыў вучыцца (у шырокім сэнсе), будатрады далі працоўныя навыкі. А гэта — не так ужо і мала.

Іна Карнялюк, гістфак, свабоднае размеркаванне:

— Мы многае атрымалі ў галіне агульнай адукацыі. Як гаварыў некалі прафесар Л. С. Абецэдарскі: «Гісторык —гэта ўсебакова адукаваны чалавек». Гэтага запавету мы і імкнуліся прытрымлівацца.

Вось і наступіў нарэшце для сённяшніх выпускнікоў доўгачаканы момант атрымання сваёй «пуцёўкі ў жыццё». Намеснік дэкана ФПМ А. В. Самусенка ўручае дыплом з адзнакай Алене Арловай.

Фота **У. Шубы.**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

ЯГО ПРЫЗВАННЕ

Першыя дні Вялікай Айчыннай вайны засталі Івана Антонавіча Карабаня ў Мінску. Горад бамбілі, бамбілі і ваенны аэрадром, на якім дыслакаваўся 263-ці батальён авіяцыйнага абслугоўвання. У тыя дні радавому Карабаню не было і 22-х, але за плячыма ў яго і Лепельскі педтэхнікум, і Аршанскі настаўніцкі інстытут, і некалькі гадоў настаўніцкай работы на Віцебшчыне, а наперадзе — 1418 дзён вайны. Калі яна скончылася, жаданне вучыцца прывяло Івана Антонавіча на філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. У 1950 годзе ён едзе на гадзічныя курсы ўдасканалення настаўнікаў пры МДУ імя М. В. Ламаносава, а з 1952 года працуе на кафедры рускай мовы нашага універсітэта.

У 1959 годзе І. А. Карабань абараняе кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную праблемам словаўтварэння, затым паспяхова займаецца даследаваннем раду праблем граматыкі сучаснай рускай мовы.

Навуковая і педагагічная дзейнасць І. А. Карабаня на працягу многіх гадоў звязана з настаўніцтвам. Працуючы ў даваенны час у школе, выступаючы з дакладамі і лекцыямі перад настаўнікамі, чытаючы курс сучаснай рускай мовы студэнтам-філолагам, Іван Антонавіч нязменна клапоціцца аб падрыхтоўцы высокакваліфікаваных настаўнікаў-славеснікаў для ВНУ і школ рэспублікі.

Камуніст з 30-гадовым партыйным стажам, Іван Антонавіч Карабань вядзе вялікую грамадскую работу.

Чалавек багатай і шчырай душы, Іван Антонавіч Карабань здабыў прызнанне, любоў і павагу ўсяго калектыву філалагічнага факультэта.

Баявыя і працоўныя заслугі Івана Антонавіча Карабаня адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. У сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння ён узнагароджан Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Віншуючы Івана Антонавіча з яго шасцідзесяцігоддзем, мы жадаем яму многіх гадоў плённай навуковай і педагагічнай дзейнасці.

Калектыў кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта.

Здаецца, толькі ўчора гэты хударлявы сарамлівы юнак пераступіў парог універсітэта, уважліва (не прапусціць бы слова!) слухаў першыя лекцыі выкладчыкаў, прыйшоў на першае для яго пасяджэнне навуковага гуртка... А ўжо сёння Ігар Жук, вучоны сакратар гуртка беларускай літаратуры, закончыў філфак, абараніў дыпломную работу, каб неўзабаве зноў сесці за кнігі — вучоны савет факультэта рэкамендаваў яго ў аспірантуру.

Прапануючы чытачам «Беларускага універсітэта» рэцэнзію Ігара Жука на новую аповесць лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Віктара Казько, хочацца пажадаць былому гурткоўцу дужых крылаў, высокага лёту ў вялікай навуцы.

В. РАГОЙША,
кіраўнік гуртка беларускай літаратуры.

СТУДЭНЦКАЯ РЭЦЭНЗІЯ

БЕРАЖЫЦЕ, ЛЮДЗІ, СОНЦА...

(Віктар Казько. Суд у Слабадзе. Мінск, 1979).

Зусім нядаўна ў адной з чарговых серый дакументальнага фільма «Вялікая Айчынная» давялося ўбачыць жахлівы, страшны ў сваёй нечалавечнасці кадр: у бруднай, чорнай хаце ляжыць дзіця, змардаванае, апухшае ад голаду. Па голаму, бездапаможнаму целу сноўдае незлічоны рой мух. Яны лезуць у вушы, рот, нос, у вочы. А хлапчук абыякавы да іх, быццам мёртвы. І толькі па ледзь прыкметных рухах ненатуральна ўздутага жывата здагадваешся, што ў гэтым зняве-чаным, змардаваным целе яшчэ цепліцца жыццё.

А вось радкі з аповесці «Суд у Слабадзе» маладога беларускага празаіка Віктара Казько: «Палаці з негабляваных дошчак, у шчылінах, чорныя, у чорным куце, каля чорнай печы. Пад ім, пад Лецечкам, дзяружка, пад дзяружкай сена ці салома, тое, што было сенам ці саломай, а цяпер пацяруха, збітая ў камякі, змолатая ў муку, захінутая дзяружкай. Дзяружкай накрыт і Колька Лецечка. Над ім рой мух і блохі. Столь заседжана мухамі да чорнага бляску. Мухі лезуць на Лецечку нахрапам. Ён душыць іх і лаецца, таму што больш нічога не застаецца рабіць, нічым іншым ён не можа дапамагчы сабе». Быццам аўтарскі тэкст да абвінаваўчага дакумента кінахронікі.

Аповесць В. Казько сапраўды як дакумент. Заснаваная на рэальным матэрыяле, яна расказвае нам пра адзін з судоў, які адбыўся над здраднікамі Радзімы пасля вайны. Разам з тым раскрываюцца новыя злачынствы фашыстаў, паўстаюць новыя карціны ўсенароднай трагедыі і гора, і самай страшнай, як заўсёды пры вялікай бядзе, была доля дзяцей.

Два вялікія полюсы жыцця: дзеці — нявіннасць і чысціня; і вайна—звярыная сутнасць фашызму. Сутыкненне гэтых полюсаў выклікала страшэнную трагедыю — дзеці, атручаныя вайной, паміралі праз дзесяцігоддзі. Вайна даганяла іх і ў нашы дні. «З грузам, цяжарам сваёй памяці яны не маглі жыць на зямлі. Зямлі было б сорамна працягваць іх жыццё».

А памяць іх, цяжкая і балючая, магла б засведчыць, як з метадычнай акуратнасцю фашысты, узброеныя навейшай медыцынскай тэхнікай, у так званых «донарскіх лагерах» — кіндэрхаймах — кроплю за кропляй высмоктвалі кроў дзяцей. Абяскроўленыя, гэтыя дзеці былі асуджаны на доўгую і пакутлівую смерць.

Такі лёс быў наканаван і Кольку Лецечку, герою аповесці «Суд у Слабадзе». І вось ён, семнаццацігадовы, памірае зараз у дзетдоме. Яго сэрца, створанае для таго, каб біцца роўна і спакойна, не можа вытрымаць болю і адчаю, нянавісці і жаху, якія выпалі на яго долю. Яшчэ і зараз кідала Лецечку ў дрыжыкі, «як толькі бачыў ён чалавека ў белым медыцынскім халаце, а варта было дакрануцца да голага цела стэрэаскопам, як ён упадаў нібы ў сон, і потым патрэбен быў дзень, а то і два, каб апрытомнела, згушчаюцца фарбы, ствараецца страшнае сваёй змрочнасцю сілавое поле (герой, а разам з ім і чытач, аж задыхаецца). І ў гэтай змрочнай, напружанай цішыні гучаць страсныя словы-запавет Колькі Лецечкі: «...беражыце, людзі, сонца!» «Сонцу няма патрэбы глядзець на мерцвякоў, яно не хоча бачыць апачвараную снарадамі, вайной зямлю. Сонцу патрэбна шчаслівая зямля, якая не ведае гора, слёз, трупаў».

Чытаючы аповесць, акунаючыся ў жыццё, і не заўважаеш, не шукаеш тых сродкаў, спосабаў, якімі ўздзейнічае на цябе гэтая проза. Проста ты пераканан, ты ўжо ў палоне яе доказаў і логікі — настолькі сур'ёзна і важка, настолькі прадумана тут усё. Бо і сама задача надзвычай складаная і важная. Гэта — праўда. Вострая, хвалюючая праўда непасрэднага аўтарскага сведчання пра чалавека і яго сутнасць. Рэальнае і ірэальнае, разнастайныя формы ўмоўнасці, алегорыю, разгорнутыя метафары, сімволіку — усе гэтыя сродкі выкарыстоўвае В. Казько з пачуццём меры, каб гэтая ўмоўнасць не ператварылася ў вычурнасць, а сцвярджала ісціну: кожнай справе чалавека, кожнаму чалавеку наогул ёсць свой судны час і судны дзень. Ёсць ён і для Колькі Лецечкі, настаў ён і для паліцэйскіх. І гэта іх віна ў тым, што Лецечка не зможа шмат «рабіць таго, што павінен зрабіць, што павінен пакінуць пасля сябе чалавек. І ён вінаваціўся ў тую хвіліну перад усім белым светам за не зробленае ім, не здзейсненае, за тое, з чым застаецца чалавек сам-насам у свой апошні судны дзень і судны час. Ён заставаўся ні з чым».

Колька Лецечка застаўся з няспраўджанымі марамі, але і з вялікай любоўю да жыцця, чаго не здолела забіць у ім вайна. І ў гэтым яго перамога. І іменна таму яму наканавана стаць самым страшным абвінаваўцам і суддзёй.

Па свайму драматызму, напружанню і страснасці, па свайму эмацыянальнаму напаўненню аповесць набліжаецца недзе да шолахаўскага «Лёсу чалавека». Нетаропка, непаспешліва вядзе апавяданне В. Казько, але ўпэнена і цвёрда, прымушаючы чытача хвалявацца, думаць, любіць і ненавідзець. Сапраўды, што называецца, з душы ў душу, з сэрца ў сэрца. А ў гэтым — прыкмета сапраўднага таленту. **Ігар ЖУК.**



А. КАНАПЕЛЬКА

Свету шчасце салаўі прарочаць.
Вам прыходзілася слухаць іх,
Варвары дваццатага стагоддзя,
У сваіх катэджах дарагіх?
Не адгарадзіцца акіянам
Вам ад беларускіх салаўёў,
Што на кулямі зямлі ўзаранай
Так спяваюць—не знайсці і слоў!
Прапануеце сваю ім бомбу?
(Птушкі ж да мыслення не дайшлі!)
Слухайце: у скверах над надгроб'ямі
З крыку аж зайшліся салаўі.
І на досвітках у росным жыце
Пратэстуюць гнеўна салаўі...
Землякі, у чым жыццё зямлі,
Калі ласка, ім вы раскажыце!..

К. ЦЫБУЛЬСКІ

Шмат чаго на вяку край мой зведаў,
Долю прадзедаў біч хрысціў панскі.
За сахой дзед не спаў і не снедаў—
Цяжка хлеб здабываўся сялянскі.
Ды ў кастрычніку залпам «Аўроры»
Царскі лад ненавісны быў змецен.
І ў нас, пад шчасліваю зоркай,
Шмат злажылі пра Леніна песень.
Толькі зноўку ліхая навала,
У 41-м зямлю апаліла.
Беларусь мая родная стала
Для праклятых фашыстаў магілай.
Паднялася з руінаў краіна,
Сіняй Нараччу раны амыла.
Інстытуты, заводы, плаціны
На пакутнай зямлі нарадзіла.
Толькі боль неўміручы ад страты,
Толькі ў целе шчэ муляюць кулі.
Толькі шмат абеліскаў салдатам,
Толькі рана ссівелі матулі...

НАШ АДРАС

220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

Заказ № 1006. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. АТ 08784